(1874–1941). Сам Уласаў (мал. 3) параўноўваў рэдакцыю і характар яе існавання з Запарожскай Сеччу, а Антона Луцкевіча падчас супрацоўніцтва лічыў сваім галоўным памочнікам у стварэнні і адборы тэкстаў, якія ішлі ў друк. А. Луцкевіч з нагоды шэрагу абставін меў прыязнае стаўленне да фальклорнай спадчыны беларусаў, лічыў карысным і патрэбным змяшчаць прысвечаныя ей матэрыялы на старонках газеты [4]. Змястоўны матэрыял пра фальклярыстычную складовую «Нашай Нівы» другой дэкады XX стагоддзя падрыхтаваў даследчык Іван Ясюк [5].

Аналізуючы артыкул «Нівы» ад 5 снежня 1914 года з назвай «Каляды», аўтарам якога з'яўляўся Власт ('Власт' – псеўданім Вацлава Ластоўскага), І. Ясюк адзначае: «у гэтым артыкуле… расказваецца гісторыя таго, адкуль узялося свята Каляды: апісваецца барацьба цемры (злога) з Соўнейкам (дабром)» [5, с. 115]. Безумоўна, у калядным артыкуле відавочныя даследчыцкая канцэптуальнасць, а таксама жаданне адшукаць у фальклоры адлюстраванне метафізікі сусветных законаў з боку В. Ластоўскага. Як вядома, святы т. зв. «Сонечнага крыжа» (двух сонцаваротаў и дзвюх раўнадзенстваў) сапраўды вызначаюцца паводле суадносін светлай і цёмнай часткі сутачнага цыклу (Каляды – найдаўгая ноч, а таксама найкароткі дзень у годзе, Купалле – наадварот). Такі ж падыход Власта адсочваецца, калі І. Ясюк цытуе крыху ранейшы яго артыкул («Наша Ніва» № 22 ад 31.05.2012) прысвечаны Купаллю: «Розные старонкі і розные народы, залежна ад характэру сваей душы, маюць характэрные свае абычаі і сьвяты… Наш народ выяўляе свой характар у сьвяткаванні Купальля. Беларус па прыродзе сваей песьняр-паэт… Аснова гэтага сьвята крыецца ў вельмі даўных часах. Гэта было праўда сьветла, праўды. Сьвята сонца, каторае асіліло зіму, разагрэло зямлю, запладзіло і пазвало ўсё да жыцьця… Вось-жэ ніхай усюда на Беларусі, дзе толькі жыве сьвядомасць нацыональная беларуская, маладзёж у гэтую ноч выходзіць» [5, с. 113]. Трэба адзначыць, што свае пранікнёныя і ўзнёслыя артыкулы, прысвечаныя Купаллю, у «Нашай Ніве» публікавалі Янка Купала (які заклікаў, каб Купалле стала «святам нацыянальнага адраджэння»), а таксама Змітрок Бядуля [5, с. 114].

7 мая 1915 года «Наша Ніва» друкуе артыкул Змітрака Бядулі «На Сёмуху». Як адзначае І. Ясюк: «За аснову бярэцца апісанне свята: "красныя дзеванькі выходзюць на зялёны луг з венкамі на русых галованьках, вядуць карагоды ды голасна пяюць…". Але край яшчэ не аправіўся пасля цяжкай вайны, таму і святы атрымліваюць негатыўную афарбоўку, настрой апавядання мінорны: "сьвяткі ў нас сёлета не зялёныя, а чырвоныя. Бо кроў і агонь афарбавалі наш край многапакутны. Атрута сьмерці пакалечыла жыцьцё горкаю палынь-травою…"» [5, с. 114].

Таксама ў 1914–1915 гадах у газеце друкаваліся салдацкія песні (пакольк шла вайна), разбіраліся прынцыпы стаўлення да фальклорнай спадчыны свайго народа, якая ні ў якім разе не павінна падмяняцца культурнымі стандартамі суседзяў, а з'яўляцца асновай ідэнтычнасці і самавызначэння беларуса, безумоўна, не адмаўляючы далучэння да ўсіх дасягненняў прагрэсу і грамадскіх вольнасцяў, якія вынайшла XX стагоддзе.

Аналізуючы спадчыну, якую пакінула «Наша Ніва» ў 1910-х гадах, І. Ясюк падсумоўвае: «…фальклорна-міфалагічныя тэмы падаюцца тут не для навуковага аналізу, а выконваюць культурна-асветніцкую функцыю. Але гэта няцяжка зразумець, ведаючы скіраванасць газеты; тут ярка праяўляецца яе функцыя ўздзеяння на чытача. "Наша Ніва" ўнесла вялікі ўклад у справу захавання фальклорнай спадчыны народа – праз заклік да збору фальклорных адзінак, праз наяўнасць (хоць і невялікага) аналізу збору песень» [5, с. 116].

У сваёй дзейнасці на пасадзе рэдактара А. Луцкевіч імкнуўся доўжыць прынцыпы, заяўленыя рэдакцыяй пры фундаванні газеты: «…Ведайце добра, што "Наша Ніва" газета не рэдакцыі, але ўсіх беларусаў і ўсіх тых, хто ім спагадае. Кожны мае права быць выслуханым на страніцах нашай газеты і кіраваць ёю, толькі каб было разумна. Мы з сваёй стараны будзем старацца, каб усе беларусы, што ня ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы і памаглі нам у нашай рабоце» [1, с. 164]. Досвед, які быў набыты пры працы з карэспандэнтамі выдання, з'явіўся добрым унёскам у фарміраванні яго як асобы чалавека, у будучым ачаляўшага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі.

**Спіс літаратуры:**

1. Баршчэўскі, Л., Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – 596 с. : іл.
2. Миллер, А. Почему все континентальные империи распались в результате Первой мировой войны / А. Миллер // Polit.ru [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу : https://polit.ru/article/2006/04/11/miller2/. – Дата доступу : 19.11.2019.
3. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху. Выбраныя творы / А. Луцкевіч / укладанне, прадмова, каментар, анатаваны індэкс імёнаў Анатоля Сідарэвіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – 287 с.
4. «Наша Ніва». Штотыднёвая газета. Факсімільнае выданне. – Выпуск 5. 1912 –1915, 1920 гг– Мінск : Тэхналогія, 2010. – 702 с.
5. Ясюк, І. Міфалогія і фальклор на старонках «Нашай Нівы» 1912–1915 гг. / І. Ясюк // Беларускае літаратуразнаўства: навук.-метад. зборнік / гал. рэд. Л. Сінькова. – Вып. 10. – Мінск : БДУ, 2012. – С. 111–115.
6. Laučkaitė, L. Art in Vilnius 1900–1915 / L. Laučkaitė. – Vilnius : Baltos Lankos publishers, 2008. – 199 p.

***Дана Струнеўская***

## АСЭНСАВАННЕ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ІВАНА ЛУЦКЕВІЧА Ў XXI СТАГОДДЗІ

***Dana Strunevskaya***

## UNDERSTANDING THE ETHNIC AND CULTURAL ACTIVITY OF IVAN LUTSKEVICH IN THE XXI CENTURY

*У артыкуле на падставе абагульнення сучасных звестак пра лёс і памкненні Івана Луцкевіча (1881–1919) зроблена спроба асэнсаваць яго ўнёсак у народазнаўства і культуразнаўства.*

*In the article on the basis of generalization of contemporary information about the fate and aspirations Ivan Lutskevich (1881-1919) made an attempt to understand its contribution to culture.*

З нагоды 100-годдзя Беларускай народнай рэспублікі ў 2018 годзе ўвага грамадства і СМІ была прыцягнута да тагачасных дзеячоў нацыянальнага руху, і адным з найбольш цікавым сярод іх, на мой погляд, з'яўляўся Іван Луцкевіч (мал. 1). Грамадзянін, навуковец, адзін з пачынальнікаў і ідэолагаў беларускага руху, які аддаваў сябе цалкам на карысць Айчыны, а таксама па шэрагу вынікаў уласнай дзейнасці можа лічыцца чалавекам, без якога сучаснай Беларусі, магчыма, і не існавала б. На жаль, яго імя ў структурах паўсядзённасці сучасных беларусаў амаль не ўзгадваецца, што як мінімум непаважліва, а ў перспектыве – можа быць надзвычай шкодна станаўленню нашай краіны, а таксама яе будучыні.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Малюнак 1 – Іван Луцкевіч (1881–1919)



Малюнак 2 – Знойдзеная І. Луцкевічам рукапісная кніга беларускіх татараў «Аль-Кітаб» [1]




Малюнак 3 – Вокладка выдання зборніка беларускіх вершаў М. Багдановіча, якое фундаваў І. Луцкевіч [1]

Іван Луцкевіч нарадзіўся ў 1881 годзе ў мястэчку Шаўлі, што на Ковеншчыне. Яго бацька браў удзел у легендарным паўстанні Кастуся Каліноўскага, але пазней здолеў пазбегнуць паліцэйскага праследу і нават уладкавацца на працу чыгуначнікам. Адчуць сябе беларусам маладому чалавеку дапамаглі творы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884), Францішка Багушэвіча (1840–1900), а таксама асабістае знаёмства з пісьменнікам і мастаком Карусём Каганцом (1868–1918). Яшчэ ў мінскай класічнай гімназіі 16-гадовы Іван Луцкевіч разам з малодшым братам Антонам стварыў нефармальную супольнасць аматараў беларускай гісторыі. Адначасова з паступленнем ў Пецярбургскі ўніверсітэт І. Луцкевіч пачынае актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Ён з'яўляўся адным са стваральнікаў кола беларускай народнай асветы і культуры, а таксама стаў сапраўдным лідарам Беларускай сацыялістычнай грамады.

Луцкевіч – аўтар навукова-публіцыстычных прац па гісторыі, мастацтве, кніжнай культуры Беларусі, аповесці «Дым і попел» – апісання знойдзенай ім рукапіснай кнігі беларускіх татараў «Аль-Кітаб» і помніку старабеларускай літаратуры XVI ст., пісаным карункавай арабскай графікай (мал. 2).

У антыкварных калекцыях Івана Луцкевіча былі адмысловыя экспанаты, якія пазней сталі асновай створанага ў 1921 годзе першага Беларускага нацыянальнага музэю ў Вільні.

Патрыятычная адукацыя працягвалася і ў Мінску, куды Луцкевіч пераехаў у 1897 годзе і дзе працягваў вучобу ў гімназіі. Аматар даўніны і антыквар-пачатковец, ён трапіў пад уплыў буйнога археолага і антыквара Генрыха Татура (1846–1907), якога палякі называлі беларускім нацыяналістам. Уплываў на яго і нашчадак старога беларускага роду Казімір-Рафал Каралевіч Кастравіцкі, больш вядомы як Карусь Каганец.

Іван Луцкевіч стаў ініцыятарам стварэння Беларускага Навуковага Таварыства (БНТ). Яно было заснавана на Беларускай Канферэнцыі ў Вільні. Луцкевіч, які стаў намеснікам старшыні БНТ, перадаў у яго распараджэнне свае калекцыі. Гэтыя калекцыі сталі асновай адчыненага ў 1921 г. Беларускага музею ў Вільні.

Івана Луцкевіча называюць адным з бацькоў беларускага адраджэння. Сёння грамадства імкнецца ведаць сваіх гeroяў не толькі з аднаго боку – дзейнасці чалавека, але і з прыватнага: яго характар (які, магчыма, паўплываў на дзейнасць разглядаемай асобы), а таксама зазірнуць праз час і даведацца пра цікавыя факты з жыцця гістарычнага дзеяча. У 2016 г. у беларускім інтэрнэце з'явіўся артыкул да 135-годдзя з дня нараджэння Івана Луцкевіча. Увазе чытача было прапанавана разгледзець цікавыя факты. Вось якім чынам гэтыя факты характарызавалі І. Луцкевіча [1]: даследчык з псеўданімам Васіль Дэ-Эм падкрэслівае, што І. Луцкевіч «…***меў вельмі нервовы характар».*** Грамадскі дзеяч Адварды Будзька адзначаў, што Іван Луцкевіч «...шмат бяды меў, здабываючы грошы на пільныя расплаты за беларускія выдавецтвы і на даўгі; аж мне здаецца, што ад прыкрасці з гэтага стаўся нервовым. Гэты дэфект нажыўшы – нажыў сабе і абідчыкаў».

Па ўспамінах каханай Івана Луцкевіча Юліяны Вітан-Дубейкаўскай (у дзявоцтве Юліяны Мэнке), «...ён – энтузіяст, ідэаліст, жывы, рухавы, запальны, хутка дэнерваваўся, і калі ўспыліў, быў няўстрыманы й мог добра вылаяць, але гэта хутка ў яго праходзіла і ён потым шкадаваў свой гнеўны парыў...» [1].

Па-за ўвагай сучаснікаў не засталося, што І. Луцкевіча «…***вальсы Шапэна натхнялі …на рамантычна-любоўны настрой».*** Юліяна Вітан-Дубейкаўская пісала: «Выпіўшы гарбату, пан Іван пачаў перабіраць ноты на піяніна і, знайшоўшы вальсы Шапэна, папрасіў Лялю [Ляля Мэнке – малодшая сястра Юліяны, актрыса Беларускай драматычнай дружыны Францішка Аляхновіча – В. Дэ Эм] іх зайграць. «Мне хочацца гэты прыемны вечар закончыць прыгожай музыкай!» Я села каля яго на канапе. Мы слухалі, марачы кожны сваё, раптам пан Іван узяў маю руку й пачаў ціха гладзіць кожны пальчык, а затым затрымаў у сваёй руцэ, пакуль Ляля ня скончыла ігру. «Ну, мне пара дахаты, – падняўся пан Іван. Я праводзіла яго на вуліцу. Ён ціха сказаў: "У мыслях я цалаваў вам кожны пальчык…» [1].

Васіль Дэ-Эм адзначае, што І.Луцкевіч «***…адшукаў святую для мусульман кнігу, напісаную па-беларуску,*** «***Аль-Кітаб».*** У артыкуле за 1918 г. «Ай-Кітаб-Кіцёп» (які быў надрукаваны ў «Беларускім жыцці" № 6, 1920) ён пісаў: «Ай-Кітаб» (...) збеларушчылі ў слова „Кіцёп». Гэта кніга святая ёсць тлумачэнне Карану, яго важнейшых прыповесцяў. (...) Пісаны па-беларуску Каран і „Ай-Кітаб» выходзіць з ужытку і як непатрэбная рэч затрачываецца. Доўга прышлося шукаць яе вучоным і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

толькі шчаслівы выпадак давёў мяне да яго ў 1915 г. перад заняццем Вільні немцамі. Знайшоў я яго ў татарскага муллы Сцяпана Палтаракевіча ў ваколіцы Сорак-Татары пад Вільняй”» [1].

Тыя, хто ведаў побыт сям'і Луцкевічаў, адзначалі: «***Прыслуга абуралася, што замест саланіны Іван Луцкевіч купляў старадаўнія рукапісы:*** «...дала пану Івану грошы й даручэнне зайсці па дарозе да кумы, каб забраць замоўленую з вёскі саланіну. Доўга пан Іван не вяртаўся, а калі прыйшоў, то ня мог нахваліцца, які цікавы рукапіс здабыў замест саланіны. На вячэру мусілі затое есці сухі хлеб. Ён гатовы ўсе грошы траціць у свой!» [1].

Сябры І.Луцкевіча шкадавалі, што ён «…***не любіў пісаць артыкулаў».*** Па ўспамінах Максіма Гарэцкага: «Гутарка Івана Луцкевіча была зазвычай цікаўная і цэнная, бо ён меў багатае навуковае знаццё і аж да смерці йшоў разам з сусветным прогрэсам. Хацелася іногды схапіць карандаш і запісываць за ім, каб ды ня згубілася, бо сам Іван Луцкевіч работу свайго пяра ўсё адкладваў на пазьнейшы, вальнейшы ад чорнае працы час, – усё адкладаў і забраў ад нас сваё знаццё з сабою ў труну”» [1].

У некаторых пытаннях І.Луцкевіч быў досыць паслядоўным і прынцыповым, напрыклад, вядома, што ён «…***быў у канфлікце з Вацлавам Ластоўскім».*** Вітан-Дубейкаўская пісала пра Ластоўскага: “...у яго была хваравлівая амбіцыя, ён ня мог прымірыцца, чаму ня ён, а браты Луцкевічы, асабліва Іван, іграюць першую скрыпку сярод беларусаў. Спачатку ён стараўся капіяваць Івана (...) А потым стараўся вылазіць наперад са сваімі, другі раз, недарэчнымі прапазыцыямі, ён хацеў стаяць на чале беларускага вучыцельскага саюзу і разбіваў дружную працу, а ў апошнія гады нямецкай акупацыі (...) падпаў пад уплыў нямецкага палітычнага агента Зуземіля і стаў рабіць праз гэта проста шкодную працу. (...) Іван усё ня мог прымірыцца з гэтым, як можна ставіць свае асабістыя амбіцыі вышэй справы грамадскай. (...) ведаю, што (...) В.Ластоўскі (...) псаваў ня раз Івану нэрвы”» [1].

І. Луцкевіч не быў канфліктным па сутнасці, наадварот, часам праяўляў вельмі шчыры клопат пра сяброў, напрыклад ***частаваў параненага Максіма Гарэцкага вінаградам: «***...у лістападзе 1914-га году сустрэліся мы ў віленскім гошпіталі „Мішмерас Хойлем», дзе я ляжаў цяжка паранены, з аскялёпкам нямецкае гранаты ў назе. Ня блізкі свет і мокрае надвор'е, а Іван Луцкевіч даведаў мяне пры першай магчымасці, прынёс вінаграду, разгаманіў мяне, быццам дыхнуў свежай струёй няўмірушчага жыцця. (...) посьле-ж таго, як мяне даведаўся Іван Луцкевіч, я ляжаў там як у сваёй хаце пад апекай маткі і добра лепшаў”» [1].

Аматары гісторыі патаемных суполак адзначалі, што І.Луцкевіч «…***разам з братам Антонам быў адным з заснавальнікаў першай у Вільні масонскай ложы «Лучнасць».*** Гісторык Аляксандр Смалянчук у артыкуле «Беларускі рух пачатку XX ст. і ідэя палітычнай нацыі» адзначае: «...ў 1910 г., (...) у Вільні ўзнікла масонская ложа «Лучнасць», сярод заснавальнікаў якой былі браты Луцкевічы. Гэта ложа аб'ядноўвала прадстаўнікоў дэмакратычных плыняў польскага, беларускага, літоўскага, яўрэйскага і рускага этнасаў» [1].

Вялікі досвед грамадска-палітычнай дзейнасці дазваляў І.Луцкевічу паводзіць сябе ў складаных сітуацыях досыць карэктна, напрыклад ён ***ніколі не пазычаў грошай у палітычных партнёраў.*** Вітан-Дубейкаўская ўспамінае, як Іван Луцкевіч вучыў яе: “Памятайце, што калі б, паміж іншага, палкоўнік Р. (Oberst R.) прапанаваў грошы на падарожжа, то зрабеце гэтак, быццам пані не зразумела, у чым справа. Каб застацца незалежным, ніколі нельга браць грошай у палітычнага партнёра”» [1].

Маючы надзвычай шмат абавязкаў, І.Луцкевіч, часам недадаваў увагі блізкім, але – прызнаваў за сабою гэта і ***перад смерцю шкадаваў, што не ажаніўся з каханай Юліяй. «***Юлінька, – пачаў Іван, – гэтыя апошнія месяцы, лежачы самотны й хворы, я меў шмат часу быць із сваімі думкамі. І я думаў аб табе, я ізноў перажыў, як мы пазнаёміліся й пакахаліся, якая ты для мяне была заўсёды добрая, а я часта быў «немагчымы». А галоўнае, што я не паручыўся даць табе сваё імя. І вось гэта мяне асабліва мучыць, што за ўсімі справамі я забыўся аб нашай асабістай справе. Чаму ты мяне ў той час ня лаяла й не дамаглася свайго права?» [1].

Такія цікавыя факты складваюцца ў досыць рэльефны вобраз чалавека, які ўласныя асабістыя інтарэсы заўжды ставіў ніжэй за агульныя інтарэсы свайго народа, аб лёсе якога ён бесперапынна дбаў і клапаціўся. Падаецца, менавіта гэтая акалічнасць светапогляду дазволіла І.Луцкевічу вабіць і аб'ядноўваць вакол сябе, а таксама вакол сваіх па-беларуску арыентаваных праектаў самых розных людзей. Разам з тым, яго поспехі ў справе беларушчыны (ажыццявіць якія ў мульціэтнічнай Вільні мяжы XIX–XX стст. была досыць няпроста) не закрывалі яго кругагляд ад спадчыны іншых этнакультур: чалавек, які любіць музыку паляка Шапэна, папулярызуе татарскія рукапісы, супрацоўнічае з прадстаўнікамі дэмакратычных супольнасцей стракатага шэрагу тагачасных этнасаў Вільні (літоўцаў, габрэяў, рускіх) – відавочна з'яўляецца гарманічнай і адмысловай асобай у кантэксце этнакультурнай свядомасці, а таксама этнакультурнай дзейнасці. Менавіта такім чалавекам, скіраваным на каранёвыя гуманістычныя каштоўнасці чалавецтва як еднасці, якая мусіць вучыцца сумеснаму выжыванню і ўзаемапавазе да кожнай наяўнай этнакультуры, з якіх яно (як еднасць) і складаецца, і быў, па маім разуменні, Іван Луцкевіч.

**Спіс літаратуры:**

1. Дэ-Эм, В. 20 нечаканых фактаў пра Івана Луцкевіча / Васіль Дэ-Эм // Novychas.by [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу : https://novychas.by/poviaz/20-neczakanyh-faktau-pra-ivana-luckevicza. – Дата доступу : 02.03.2019.
2. Каўко, А. Луцкевіч Іван / А. Каўко, Г. Каханоўскі // Этнаграфія Беларусі : Энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; Рэдкал. : І. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 295.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ